*Л. А. Дзямешка,*
*прафесар кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

# ШКОЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА Ў ДАПАМОГУ АДУКАЦЫЙНА-ВЫХАВАЎЧАМУ ПРАЦЭСУ

У Праграме развіцця агульнай сярэдняй адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь на 2007–2016 гады асаблівая ўвага звернута на станаўленне і равіццё цэласнай сістэмы адукацыі і выхавання ва агульнаадукацыйных установах краіны. Створана і ўдасканальваецца нарматыўна-прававая база, вызначаны прыярытэты, канцэптуальныя падыходы, мэты і задачы, змест, формы і метады навучання, выхавання і развіцця асобы. Думаецца, у дакументах залішне малое месца адведзена школьнай бібліятэцы, а між тым яна мусіць быць эфектыўнай інфраструктурай, інфармацыйным цэнтрам, цэнтрам зносін і псіхалагічнай падтрымкі вучняў, педагогаў, бацькоў.

Калі традыцыйна школьная бібліятэка разглядалася ў якасці вучэбна-дапаможнага падраздзялення, якое забяспечвае літаратурай і інфармацыяй навучальны працэс, то на фоне змяненняў у сучаснай агульнай адукацыі ў дзейнасці бібліятэкі ўсё больш акрэсліваюцца педагагічны, выхаваўчы і развіваючы складнікі. Гэта практычная дзейнасць па навучані (трансляцыя ведаў), выхаванні (фарміраванне якасцей і перакананняў), адукацыі (назапашванне і ператварэнне ў арганічнае адзінства ведаў, навыкаў і ўменняў і маральных якасцей асобы). У гэтым плане школьная бібліятэка ўяўляецца адмысловым асяроддзем, у якім бібліятэкар выступае як тэарэтык, фарміруючы навыкі і ўменні самастойнай самаадукацыйнай дзейнасці навучэнцаў; кансультант падчас пошуку крыніц інфармацыі; настаўнік, які навучае крытычнаму асэнсаванню знойдзенай інфармацыі; арганізатар індывідуальнай і калектыўнай дзейнасці школьнікаў. Пры гэтым развіваць дзяцей, вучыць іх і выхоўваць магчыма толькі ў цесным супрацоўніцтве з педагагічным калектывам і бацькамі.

Адным з асноўных фактараў у вучэбна-выхаваўчым працэсе выступаюць інфармацыйныя рэсурсы бібліятэкі. Розныя інфарматыўныя сайты прадастаўляюць навучэнцам, педагогам і бацькам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

магчымасць не толькі атрымліваць інфармацыю, але і ўдзельнічаць у абмеркаванні актуальных педагагічных праблем. Стварэнне ў сістэме адукацыі інфармацыйнай прасторы і на лакальным узроўні (непасрэдна ў бібліятэцы), і на рэгіянальным, і на рэспубліканскім дазваляе бібліятэкару прадстаўляюць інфармацыю ў вучэбнай і выхаваўчай рабоце як магутны метадычны рэсурс. Эфектыўнасць работы павышае фарміраванне ў бібліятэках комплексу мультымедыйных сродкаў, электронных банкаў даных, метадычных напрацовак педагогаў, прэзентацый іх лепшага вопыту работы, стварэнне школьных віртуальных музеяў і інш.

Асноўныя задачы бібліятэкі:

– забяспечыць усіх удзельнікаў адукацыйна-выхаваўчага працэсу доступам да інфармацыі, ведаў, ідэй, культурных каштоўнасцей шляхам выкарыстання бібліятэчна-інфармацыйных рэсурсаў на розных носьбітах – паперным (кніжны фонд, фонд перыядычных выданняў), магнітным (фонд аўдыя- і відэакасет), лічбавым (CD-дыскі), камунікатыўным (камп’ютарныя сеткі) і інш.;

– спрыяць фарміраванню самастойнага бібліятэчнага карыстальніка: навучанне пошуку, адбору, крытычнай ацэнцы інфармацыі, засваенню новых бібліятэчных тэхналогій;

– здзяйсняць педагагічную асвету бацькоў, дапамагаць у арганізацыі сямейнага чытання, прыцягваць бацькоў да ўдзелу ў мерапрыемствах, накіраваных на развіццё зацікаўленасці дзяцей да чытання, вучобы, самаадукацыі і самарэалізацыі.

Сумесная работа з настаўнікамі, сям’ёй, вучнямі можа весціся па некалькіх кірунках. Хацелась б засяродзіць увагу на некаторых аспектах. Па-першае, гэта фарміраванне інфармацыйнай культуры.

На змену прынцыпу «адукацыя на ўсё жыццё» грамадства ведаў, да якога крочыць чалавецтва, сфармулявала іншы – «адукацыя на працягу ўсяго жыцця». Гэта значыць, што чалавеку неабходны асаблівыя веды і ўменні па рабоце з інфармацыяй, неабходна інфармацыйная культура, навыкі доступу да віртуальных сетак, веды па арганізацыі сучаснай дыстанцыйнай адукацыі як адной з формаў самастойнай бесперапыннай адукацыі. Работнікі бібліятэк актыўна ўключаюцца ў працэс. Аб гэтым сведчыць удзел школьных бібліятэк у Рэспубліканскім конкурсе на лепшыя метадычныя работы па інфармацыйнай культуры школьнікаў, створаныя на базе мультымедыйных тэхналогій. Конкурс на працягу трох гадоў праводзіў камітэт па інфармацыйнай культуры Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі. Па выніках конкурсу створаны кампакт-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дыскі шырокага рэпертуару: праграма па інфармацыйнай культуры школьнікаў; урокі для школьнікаў малодшых, сярэдніх і старшых класаў; гульні па інфармацыйнай пісьменнасці і інш. Мультымедыйныя матэрыялы разасланы ва ўсе цэнтралізаваныя бібліятэчныя сістэмы, доступ да іх неабмежаваны. Акрамя таго, існуюць аўтарскія вучэбныя праграмы і метадычныя матэрыялы, заняткі па такіх прадметах, як «Асновы бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў», «Інфармацыйная культура школьніка». Напэўна, ёсць магчымасць сумесна з Навукова-педагагічнай бібліятэкай актывізаваць гэты працэс і сярод бацькоў і педагогаў шляхам кароткатэрміновых курсаў, цыклаў лекцый, кансультацый з мэтай фарміравання сістэматызаваных ведаў, уменняў, навыкаў іх інфармацыйнай свядомасці. У школах здзяйсняецца праграма факультатыўных заняткаў для вучняў старшых класаў па падрыхтоўцы да сямейнага жыцця «Чалавек у свеце сямейных адносін», дзе педагогі выкарыстоўваюць дапаможнік Г. П. Арловай [1]. Тут ёсць магчымасць праявіць ініцыятыву і школьнаму бібліятэкару ў сэнсе ўзаемадзеяння з бацькоўскім калектывам.

Другім важным аспектам з’яўляецца ўдзел бібліятэкі ў арганізацыі і правядзенні шостага школьнага дня. Практычна існуюць пэўныя стабільнасць і сістэмнасць у яго арганізацыі. Але, на наш погляд, інфармацыйны патэнцыял школьнай бібліятэкі па забеспячэнні вольнага ад вучобы дня не выкарыстоўваецца ў поўнай меры. Школьнаму бібліятэкару неабходна больш актыўна і творча ўпісацца ў арыгінальныя мадэлі выхаваўчай работы, у рэалізацыю комплексна-мэтавых праграм, метадычныя рэкамендацыі да якіх цікава распрацаваны Нацыянальным інстытутам адукацыі [3]. Школьная бібліятэка мае магчымасць зрабіць больш разнастайным змест мерапрыемстваў, спалучыць навацыйныя і традыцыйныя формы культурна-адпачынкавай дзейнасці, а сумесна з дзіцячымі бібліятэкамі і іншымі ўстановамі культуры ўдзельнічаць у правядзенні турніраў ведаў і ўменняў, выставах творчасці вучняў, гульнёвых праграмах, інтэлектуальных спаборніцтвах, развіваць творчыя ініцыятывы дзяцей праз дэманстрацыю дасягненняў дзейнасці аб’яднанняў па інтарэсах (клубаў, гурткоў, творчых калектываў, навуковых таварыстваў і інш.).

У правядзенні шостага школьнага дня ёсць шырокая магчымасць актывізаваць пазітыўныя фактары сямейнага выхавання і гуманістычны патэнцыял школы, забяспечыць іх узаемадапаў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

няльнасць. Эфектыўнасць такой работы дасягаецца цесным супрацоўніцтвам з рознымі ўстановамі і арганізацыямі: дзіцячымі садкамі, установамі культуры, сродкамі масавай інфармацыі, цэнтрамі народных рамёстваў.

У сумеснай рабоце з педагагічным калектывам бібліятэкары ў першую чаргу кіруюцца агульнымі задачамі:

– садзейнічаць фарміраванню ў школьнікаў каштоўнасцей, ідэй, перакананняў, якія адлюстроўваюць існасць беларускай дзяржаўнасці;

– выхоўваць актыўную жыццёвую пазіцыю шляхам стварэння інфармацыйнай прасторы і ўкаранення інтэрактыўных методык, інфармацыйных тэхналогій, якія спрыяюць выпрацоўцы асабістага меркавання;

– забяспечваць комплексны падыход да арганізацыі работы з навучэнцамі, які б садзейнічаў павышэнню матывацыі да вучобы;

– спрыяць павышэнню прафесійнай і культурнай кампетэнцыі педагагічных кадраў;

– узаемадзейнічаць з усімі ўдзельнікамі адукацыйнага працэсу, здзяйсняць каардынацыю сумесных дзеянняў школы, сям’і, соцыуму.

З мэтай рэалізацыі пастаўленных задач у практыку ўкараняюцца такія формы абмеркавання актуальных праблем адукацыі і выхавання, як электронныя (завочныя) навукова-практычныя канферэнцыі, семінары, круглыя сталы. Традыцыйнымі сталі:

– інфармаванне настаўнікаў, бацькоў, вучняў аб новых выданнях, у якіх адлюстроўваюцца актуальныя праблемы сучаснага жыцця, у тым ліку праблемы навучання, выхавання, развіцця;

– вырашэнне з настаўнікамі-прадметнікамі бягучых арганізацыйных і змястоўных праблем (заказ падручнікаў, забеспячэнне школьных заданняў, падрыхтоўка да алімпіяд, планаванне шостага школьнага дня і інш.);

– актыўны ўдзел у рабоце педагагічнага савета, бацькоўскага камітэта, метадычнага аб’яднання.

Камп’ютарызацыя школы дазволіла здзейсніць праграмны праект «Школьная бібліятэка»; фонды бібліятэк уводзяцца ў электронны каталог; фарміруецца індывідуальны электронны банк інфармацыі педагога, у які ўключаюцца папкі аб інавацыйнай дзейнасці настаўніка (распрацоўкі і ілюстрацыі да ўрокаў, пазакласных мерапрыемстваў, слоўнікі да вучэбных тэм па школьнай праграме, электронныя прэзентацыі, апублікаваныя і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неапублікаваныя матэрыялы). У партфоліо педагогаў-прадметнікаў уносіцца ўся пастунаючая інфармацыя па цікавячых іх праблемах.

Пры арганізацыі работы з бацькамі бібліятэкар у першую чаргу звяртае ўвагу на адносіны ў сям'і да чытання і да дзяцей. З гэтай мэтай сумесна з сацыяльным педагогам распрацавана анкета «Чытанне ў сям'і», у якой прадугледжаны пытанні: «Якія вашы сумесныя з дзецьмі захапленні?», «Ці з'яўляецеся вы чытачамі бібліятэкі?», «Ці маеце дамашнюю бібліятэку?», «Ці дапамагае вам кніга ў паразуменні з дзецьмі?», «Якія вашы адносіны да аўдыя-, відэаматэрыялаў і да кнігі?», «Ці расказваюць вам дзеці аб прачытанай кнізе?», «Якімі тэмамі больш цікавяцца вашы дзеці?», «Хто ў сям'і з'яўляецца кіраўніком чытання?», «Ці ведаеце вы любімыя кнігі вашых дзяцей?» і інш. Аналіз анкетнага апытання сведчыць аб узроўні чытацкай культуры бацькоў і дзяцей, поглядах і меркаваннях, густах і перавагах. Наогул дзяцей больш цікавяць казкі, быліны, па якіх створаны знаёмыя ім мультфільмы, тэлеперадачы; моладзь – пытанні сямейных і інтымных адносін; людзей сталага ўзросту – пытанні здароўя, пераемнасці пакаленняў [2].

Найбольш традыцыйнай з'яўляецца кансультацыйная работа з бацькамі, якая павышае іх педагагічную кампетэнтнасць, паглыбляе веды ў галіне псіхалагічнай, метадычнай, дзіцячай літаратуры. Да паслуг бацькоў: наглядныя формы інфармавання, сярод якіх найбольш распаўсюджанымі з'яўляюцца выставы твораў для чытання ўсёй сям'ёй, для пазакласнага чытання падчас канікул, стэнды інфармацыі, бібліятэчныя плакаты рэкламнага характару, дзе змяшчаюцца водгукі дзяцей і бацькоў аб прачытанай кнізе; картатэкі «Сямейнае чытанне»; «Любімыя кнігі пакаленняў», памяткі і інфармацыйныя лісткі; папкі-дасье «бацькоўскі сход»; планы работы клуба выхаднога дня.

Шырокае распаўсюджанне знайшлі комплексныя формы абслугоўвання бацькоў і дзяцей – сямейныя вечарыны, гасцёўні, клубы, агеньчыкі, сумесныя вандроўкі ў свет кніг і інш. Сярод дыялогавых форм – рэкамендацыйныя, інфармацыйныя гутаркі, гутаркі аб прачытаным, па прыватных запытах.

Асаблівую важнасць набывае супрацоўніцтва і ўзаемапаразуменне з адміністрацыяй школы. Тут важнае значэнне мае не толькі высокі прафесіяналізм бібліятіэкара, але і асабістыя якасці, характар, мэтанакіраванасць, здольнасць да крытычнага аналізу сваёй дзейнасці, уменне вылучыць у ёй пазітыўнае, знаходзіць і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўкараняць інавацыі. На наш погляд, можна выкарыстоўваць наступныя парады:

– у гадавы план работы бібліятэкі ўключыць праграмы і праекты, рэалізацыя якіх запавольваецца без адпаведнага рэсурснага забеспячэння; значнасць іх абмеркаваць з адміністрацыяй;

– стаць актыўным членам педагагічнага савета школы, метадычных аб’яднанняў, рэгулярна засяроджваць увагу на актуальных для школы і бібліятэкі праблемах;

– імкнуцца да ўсебаковага выкарыстання бібліятэчнага памяшкання;

– рыхтаваць і абмяркоўваць з адміністрацыяй квартальныя справаздачы аб працэсе рэалізацыі плана на дадзены год.

Такія дзеянні дапамогуць знайсці сяброў-аднадумцаў, стварыць бібліятэчны актыў, сфарміраваць станоўчы імідж бібліятэкара школьнай бібліятэкі ў вачах адміністрацыі і паспрыяць станоўчаму вырашэнню розных праблем.

Для эфектыўнай работы з усімі членамі школьнай супольнасці (вучнямі, настаўнікамі, адміністратарамі, выхаваўцамі, бацькамі) школьны бібліятэкар павінен валодаць пэўнымі камунікатыўнымі кампетэнцыямі – уменнямі і ведамі зносін і ўзаемадзеяння. Кампетэнтнасць супрацоўнікаў школьнай бібліятэкі можна вызначыць наступным чынам: інфармаванасць аб дасягненнях у галіне педагогікі, псіхалогіі, электронных тэхналогій; уменне добразычліва і без прадузятасці наладзіць стасункі з дзецьмі і дарослымі; зразумець дакладнасць патрэб карыстальнікаў і іх матывы; умець працаваць з асобнымі людзьмі і групамі ўнутры пазашкольнага асяроддзя; ведаць і разумець методыку навучання і выхавання; валодаць прафесійнымі навыкамі працы з інфармацыяй увогуле і інфармацыйнымі рэсурсамі бібліятэкі ў прыватнасці; ведаць дзіцячую літаратуру, мультымедыйныя матэрыялы, інфармацыйную тэхніку; арыентавацца ў сферы маркетынгу, менеджменту, фандрэйзінгу. У такім русле вядзецца падрыхтоўка бібліятэкараў вышэйшай адукацыі на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

1. *Арлова, Г. П.* Народная педагогіка як сродак выхавання вучняў: дапам. для педагогаў агульнаадук. і ўстаноў пазашк. выхавання і навучання / Г. П. Арлова. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2009. – 146 с.

2. *Дзямешка, Л. А.* Бібліятэка сямейнага чытання: тэарэтычнае і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

практычнае асэнсаванне / Л. А. Дзямешка // Бібліятэка прапануе. – 2009. – № 9. – С. 23–32.

3. *Методические* аспекты совершенствования воспитательной работы в шестой школьный день // Зборнік нарматыўных дакументаў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. – Мінск, 2008. – № 21. – С. 11–54.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ